Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2012-06-29

# Скрыжалі паэтычнай споведзі

**У Цэнтры культуры Лагойска прайшоў шэраг мерапрыемстваў, якія атрымалі агульную назву “Традыцыі кніжнасці як фактар духоўнай пераемнасці”.**

**Максім ЛАГАЙЧАНІН**

“Традыцый кніжнасці...” не было б без руплівасці супрацоўнікаў Лагойскага райвыканкама Аляксандра Кулінковіча, намесніка старшыні, і Вольгі Антаневіч, начальніка аддзела культуры, а таксама прадстаўнікоў Нацыянальнай акадэміі навук Сяргея Чыжыка, намесніка старшыні прэзідыума, і Аляксандра Кавалені, акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў. Але ў цэнтры ўсіх падзей знаходзілася адна асоба. Гаворка ідзе пра Валерыя Максімовіча.

Ураджэнец вёскі Траянец Лагойскага раёна, ён закончыў філалагічны факультэт БДУ, абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі па філалогіі. Працаваў у сваёй alma mater, потым першым прарэктарам Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, НАН Беларусі. Апошнім часам з’яўляецца в.а. намесніка дырэктара Інстытута філасофіі.

Першая частка мерапрыемстваў мела характар навукова-практычнай канферэнцыі. Заўважу, што ёй папярэднічала ўступнае слова С. Кулінковіча і прывітанне С. Чыжыка. Удзельнікі заслухалі даклады самога Валерыя Аляксандравіча (“Літаратурныя і культурна-гістарычныя традыцыі ў захаванні духоўнасці асобы і грамадства”) і аспіранткі Інстытута мовы і літаратуры Людмілы Іконнікавай (“Сучасная беларуская літаратура: духоўны патэнцыял, набыткі і перспектывы”).




Другая частка ўяўляла сабой прэзентацыю дэбютнага паэтычнага зборніка Валерыя Максімовіча “Мяцежнай споведзі скрыжалі”, што сёлета ўбачыў свет у выдавецтве “Ковчег”. Сваімі ўражаннямі пра творчасць калегі падзяліліся галоўны рэдактар часопіса “Полымя” Мікола Мятліцкі і старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась Пазнякоў. Нездарма Міхась Паўлавіч адзначыў у прадмове да зборніка, што паэзія Валерыя Максімовіча “зачароўвае сваім гарачым, энергічным, жыццесцвярджальным словам, сваёй бязмернай і самаахвярнай любоўю да Радзімы, да маці, да сваіх продкаў, да сваіх вытокаў”. А старшакласніца Акцябрскай сярэдняй школы Лагойскага раёна Надзея Капрэцкая выступіла з паведамленнем “Патрыятычныя матывы ў творчасці паэта-земляка Валерыя Максімовіча”.

Нарэшце, трэцяй часткай мерапрыемстваў стала канцэртная праграма “З песняй у сэрцы”, падчас якой прагучалі песні на словы Валерыя Максімовіча ў выкананні саліста Дзяржаўнага ансамбля “Песняры” Алега Жалязнякова і ансамбля Акцябрскага сельскага Дома культуры Лагойскага раёна.